УДК 17.023.32:[008(=161.3)+172]

*К. Ф. Лысак*

## Этас: паняцце, сферы выяўлення нацыянальнага этасу

*Аўтар аналізуе трактоўкі паняцця «этас», спасылаючыся на антычныя крыніцы і працы даследчыкаў у галіне этнапсіхалогіі, культурантрапалогіі, сацыялогіі і філасофіі. Тэрмін «этас» напачатку азначаў устойлівыя індывідуальныя рысы характару, а з цягам часу пашырыўся да значэння культурнай характарыстыкі, адлюстраванай у сістэме норм, каштоўнасцей і ідэалаў пэўнай сацыяльнай групы і выяўленай у яе практычнай дзейнасці. Аўтар акрэслівае тыя сферы жыццядзейнасці, дзе ўяўленні аб ідэальных адносінах паміж прадстаўнікамі нацыі дазваляюць ахарактарызаваць яе этас. Звернута ўвага на існуючыя нормы, якія павінны рэгуляваць адносіны беларусаў у галіне ажыццяўлення ўлады, узаемаадносін разнастайных сацыяльных груп, а таксама ў стварэнні, захаванні, распаўсюджанні і засваенні нацыянальнай культуры.*

Змест маральных норм, ідэалаў і каштоўнасцей з'яўляецца асновай для разумення стылю жыцця і культуры нацыянальнай супольнасці. Асэнсаванне ўласнай самасці і нацыянальнай адметнасці дае магчымасць Рэспубліцы Беларусь як адносна маладой дзяржаве зразумець сваё гістарычнае прызначэнне і месца сярод іншых краін. Даследаванне паняцця «нацыянальны этас», скіраванае на пераадоленне няўстойлівасці яго тэрміналагічнага статусу і вызначэнне сфер выяўлення, паспрыяе больш глыбокаму асэнсаванню адметнасці беларускай культуры.

Паняцце «этас» (ад грэч. *ethos* – месцазнаходжанне, звычай, нораў, характар) налічвае адносна вялікую колькасць інтэрпрэтацый. Старажытнагрэчаскі філосаф Геракліт разглядаў этас як сукупнасць тыповых і ўстойлівых рыс індывіда, якая мае большую дынаміку ў параўнанні з характарам [17, с. 41–52]. Гэта робіць яго блізкім да «эйдасу» Платона як нейкай устойлівай структуры і чагосьці нязменнага, назаўсёды зададзенага.

Паняцце «этас» ужываецца і ў антычнай рыторыцы. У класіфікацыі відаў аргументаў Арыстоцеля, крытэрыямі якой сталі пачуццёвы, разумовы і маральны пачаткі ў чалавеку, вылучаюцца пафас, логас і этас. Этас успрымаецца як устойлівы маральны аргумент і супрацьпастаўляецца пафасу як часоваму душэўнаму перажыванню [4, с. 752–753]. Менавіта таму філасофскую дысцыпліну пра мараль назвалі «этыкай». У «Нікамахавай этыцы» Арыстоцель вылучыў у чалавеку этычныя (маральныя) ці дыянаэтычныя (разумовыя) дабрачыннасці [4, с. 167]. Увогуле, этас у антычнасці разглядаўся ў кантэксце касмацэнтрычнай канцэпцыі як нейкая трывалая нязменная мадэль, якая мае вытокі з адзінага пачатку.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У эпоху Сярэдневякоўя паняцце «этас» шырока не выкарыстоўвалася, але пошукі агульнага маральнага пачатку назіраліся і ў гэты перыяд. П. Абеляр ролю сродку пазнання Бога адводзіў этыцы, а пазнанне чалавекам сябе прыраўноўваў да богапазнання. Шлях да вышэйшага дабра, утаймаванне грахоўных памкненняў Фама Аквінскі бачыў у дабрачыннасцях чалавека. Як і Арыстоцель, ён падзяляў дабрачыннасці на разумовыя і маральныя і лічыў іх роўнымі паміж сабой [15]. Такім чынам, крыніцай маральных асноў у Сярэдневякоўі з'яўляўся Бог. Шлях да разумення Боскай сутнасці ішоў праз дабрачыннасці. Як бачым, у Сярэдневякоўі маральны аспект разглядаўся ў рэчышчы тэалогіі і хрысціянскай дактрыны.

Асобнае месца ў галіне вывучэння маралі ў Новым часе займае кніга Б. Спінозы «Этыка, даказаная ў геаметрычным парадку», у якой Богу адводзіцца роля прычыны ўсяго, што адбываецца з чалавекам у жыцці. У духу сярэдневяковых папярэднікаў Б. Спіноза галоўнай дабрачыннасцю лічыў пазнанне Бога. Пры гэтым ён вылучыў устойлівыя элементы чалавечай прыроды: задавальненне, незадавальненне і жаданне. Яны могуць спалучацца паміж сабою. Спіноза назваў афектам як стан чалавечай душы, які мае невыразныя ці выразныя ідэі, так і звязаны з гэтым стан чалавечага цела. Ідэі ён характарызуе як патрэбы, звязаныя з самазахаваннем і падтрыманнем жыццядзейнасці чалавека. Правільнае абмежаванне і спалучэнне афектаў філосаф лічыў неабходнай умовай для дасягнення шчасця. Такім чынам, Б. Спіноза выказаў думку аб наяўнасці ўстойлівых кампанентаў сутнасці чалавечай натуры, якія непасрэдна ўплываюць на яго практычную дзейнасць.

Канец XVIII – пачатак XIX ст. прынёс істотныя змены ў жыццё многіх народаў, найперш Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі і Еўропы. Барацьба з каланіялізмам, падзеі Вялікай французскай рэвалюцыі, пачатак распаду буйных імперый прывялі многія народы да барацьбы за ўласную незалежнасць, здабыццё дзяржаўнасці. Пад уплывам ідэй рамантызму актуалізаваліся праблемы народнай культуры, звязаныя з вывучэннем мовы, гісторыі, традыцый, звычаяў. Вынікі навуковага пошуку знайшлі сваё адлюстраванне ў такіх дысцыплінах, як мовазнаўства, гісторыя, этнаграфія [І. Г. Фіхтэ «Прамовы да нямецкай нацыі» (1808), В. Гумбальт «Аб параўнальным вывучэнні моў у дачыненні да розных эпох іх развіцця» (1820), Э. Тэйлар «Першабытная культура» (1871)].

Тэрмін «этас» у сярэдзіне XIX ст. В. Вунт выкарыстаў у кантэксце даследаванняў пытання «народнай душы». Тэрмін змяняецца ад абазначэння нейкага агульнага маральнага пачатку да значэння ментальнасці этнічнай супольнасці ці нацыянальнага характару. Этасам, народным духам, апперцэпцыяй, або калектыўнай творчай дзейнасцю, з'яўляюцца, на яго думку, вышэйшыя псіхічныя працэсы, якія ўзнікаюць пры сумесным жыцці многіх індывідаў [7, с. 21–22]. Народны дух В. Вунт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапанаваў вывучаць метадам аналізу такіх форм культуры, як мова, міфы, звычаі, якія складаюць асноўныя галіны народнай псіхалогіі [7, с. 25–26]. Такім чынам, этнапсіхалогія абгрунтавала ідэю аб наяўнасці душэўных працэсаў і з'яў не толькі ў індывіда, але і ў калектыўных суб'ектаў. Пры вывучэнні этнічнай культуры ў навуковым ужытку з'явіліся такія тэрміны, як «менталітэт», «ідэнтыфікацыя», «інтэграцыя» і інш.

Семантычнае ўдакладненне набывае паняцце «этас» у культурнай антрапалогіі. Амерыканскі культурантраполаг А. Кробер вызначаў яго як сістэму ідэалаў, каштоўнасцей, дамінуючых у культуры, якія маюць тэндэнцыю кантраляваць паводзіны яе членаў. На яго думку, этас ёсць квінтэсэнцыя ідэальнай (каштоўнаснай) культуры, якая ўвасоблена ў мастацтве, філасофіі, рэлігіі і маральных нормах. Рэальная культура складаецца з тэхнічных прыстасаванняў, прылад працы і навыкаў, скіраваных на дасягненне пэўных мэт, і праяўляецца ў тым ліку ў эканамічнай сістэме вытворчасці і размеркавання [2].

Рут Бенедыкт уводзіць паняцце «этас культуры» як культурнай тэмы, якая аб'ядноўвае канфігурацыю ўнутрыкультурных элементаў і вызначае іх змест і суадносіны. Рэлігія, сямейнае жыццё, эканоміка, палітычныя інстытуты і да т. п. разам ствараюць адзіную непаўторную структуру. Прычым з розных магчымых варыяцый тых ці іншых сістэм адносін, спосабаў дзеяння, форм грамадскіх інстытуцый у кожнай культуры прысутнічаюць толькі строга вызначаныя варыяцыі, якія адпавядаюць этасу культуры. Такім чынам, этас культуры выяўляецца ў разнастайных сферах чалавечага жыцця: у сістэмах размеркавання ўласнасці, у структурах сацыяльнай іерархіі, у матэрыяльных рэчах і ў тэхналогіях іх вытворчасці, ва ўсіх разнавіднасцях палавых узаемаадносін, у фарміраванні саюзаў і кланаў унутры грамадства, у спосабах эканамічнага абмену і інш. [13]. У працы «Хрызантэма і меч», прысвечанай даследаванню мадэлі японскай культуры, Р. Бенедыкт тыпалагізуе японскую культуру як «культуру сораму» з этычным акцэнтам на міжасобасных адносінах. Галоўным клопатам японца з'яўляецца захаванне ўласнай рэпутацыі, а яго паводзіны арыентаваны на меркаванні прадстаўнікоў яго сацыяльнага асяродку. Адсюль неабходнасць выканання прынятых у групе строгіх правіл, невыкананне якіх вядзе да пагарды з боку сям'і, сяброў, а інтарэсы групы лічацца прыярытэтнымі ў параўнанні з уласнымі.

Такім чынам, у культурнай антрапалогіі назіраецца адыход ад тэарэтызавання паняцця «этас» і робіцца інтэнцыя на яго выяўленне ў сацыяльных практыках. Уводзіцца паняцце «мадэлі культуры» як нязменнай структуры, вакол якой выбудоўваецца сістэма культуры ў розныя перыяды яе развіцця.

У кантэксце сацыялагічных даследаванняў паняцце «этас» інтэгруе маральны і практычны аспекты. Макс Вэбер увёў паняцце «гаспадар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чы этас», якое абазначае сукупнасць правіл жыццёвых паводзін, практычную мудрасць і мараль, увасобленыя ў ладзе жыцця, светаадчуванні людзей [6, с. 16]. Падобнае разуменне адкрывала шлях да даследавання прафесійнай маралі – палітычнай, прадпрымальніцкай, медыцынскай і г. д. Макс Шэлер у трактоўцы гаспадарчага этасу ўслед за М. Вэберам вылучаў этас асобнага індывіда і грамадства (народа) на аснове прынцыпу дамінавання адных каштоўнасцей над іншымі. Ва ўзаемаадносінах народаў этас вызначае характар іх «прасторы разумення» [19, с. 353].

Польская даследчыца М. Асоўская на аснове вывучэння этасу пэўных субкультур мяшчанства і рыцарства, тлумачыць гэта паняцце як стыль жыцця пэўнай сацыяльнай групы, агульную арыентацыю культуры, прынятую ў ёй іерархію каштоўнасцей [13, с. 46]. Заслугоўваюць увагі яе ідэя аб трансфармацыі этасу ў залежнасці ад гісторыка-культурных умоў і метад так званых асобасных узораў (*wzór osobowy*). Аўтар, зыходзячы з класава-саслоўнай структуры грамадства, вылучае асабістыя якасці ўзорных прадстаўнікоў арыстакратычнага (рыцарскага) і мяшчанскага грамадства. Дамінаванне ў розныя перыяды таго ці іншага ўзору адлюстроўвае гістарычную дынаміку этасу.

Такім чынам, у сацыялагічных працах трактоўкі этасу як ментальнасці і маралі аб'ядноўваюцца паміж сабою. Ён вызначаецца як іерархія каштоўнасцей, уяўленні аб ідэальных адносінах паміж людзьмі разнастайных сацыяльных груп: класавых, прафесійных і г. д. Узгодненыя ў межах гэтых супольнасцей нормы паводзін утвараюць пэўны сацыяльны код, які па ўмаўчанні рэгулюе дзеянні індывідаў у тыповых сітуацыях.

Венгерскі філосаф Е. Анчал вызначае этас як універсальны маральны пачатак, які далёка не заўсёды выяўляецца ў штодзённым жыцці. На яе думку, этасам у сваіх учынках чалавек кіруецца ў звышкрытычных сітуацыях, калі нормы звычайнай маралі не здольны даць адэкватны адказ [3, с. 15–16]. Такім чынам, Е. Анчал сцвярджае існаванне ў чалавека неадʼемнай патрэбы ў маральным парадку ў грамадстве. Пры гэтым падкрэсліваецца агульначалавечы характар этасу, яго пастаянны, гістарычна нязменны змест. Ён выступае менавіта як з'ява, якая нараджае момант маральнасці. У гэтым кантэксце змест паняцця «этас» можна звесці да паняцця «архетып» – універсальнай мадэлі несвядомай псіхічнай актыўнасці, якая спантанна вызначае чалавечае мысленне і паводзіны.

Тэарэтычная распрацоўка паняцця «этас» адлюстравана ў працах расійскіх даследчыкаў Я. У. Коваля, С. У. Карцеева, В. В. Салтыковай, У. В. Мішчанкі. Я. У. Коваль выкарыстоўвае паняцце «этас» у этыка-філасофскім аналізе этапаў грамадска-эканамічнага развіцця. Этас інфармацыйнага грамадства ён тлумачыць як сукупнасць духоўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычных рэгулятываў, што фарміруюцца ў працэсе камунікатыўнай дзейнасці людзей [10, с. 7].

В. В. Салтыкова, займаючыся вывучэннем нацыянальнай спецыфікі працоўнай дзейнасці, уводзіць паняцце «нацыянальны этас», вызначаючы яго як катэгорыю культуры, базавае ядро нацыянальных каштоўнасцей, ідэалаў, норм, асэнсаваных жыццёвых арыентацый, культурных патэрнаў, якія з'яўляюцца дамінантнымі ў кожнай канкрэтнай культуры [14, с. 13]. Аднак, на нашу думку, такое вызначэнне этасу можа быць выкарыстана ў дачыненні і да іншых сацыяльных груп: прафесійных, рэлігійных, этнічных і інш. Каштоўнасці, ідэалы, нормы пэўнага калектыўнага суб'екта могуць адлюстроўваць паводзіны сваіх носьбітаў у самым шырокім коле сацыяльных практык. Вылучэнне характарыстык нацыянальнага этасу павінна адлюстроўваць этычныя арыентацыі, нормы паводзін і каштоўнасці індывіда як носьбіта нацыянальнай свядомасці.

У айчынных даследаваннях паняцце «этас» ужываецца адносна нядаўна, аднак спробы вызначыць прыроду маральнага пачатку ў культуры беларускага народа прадпрымаліся дагэтуль. І. Абдзіраловіч адзначаў, што маральны закон з'яўляецца калектыўнай творчасцю ўсяго народа. Ён надзяляецца «Боскай сілай і атрымлівае магчымасць панаваць над людзьмі», так як маральны закон, звычаёвае права, у творчасці якога «прымае чын амаль што ўвесь народ, заўсёды мае адзнаку боскасьці». Адзнакаю Боскага натхнення, паводле меркавання У. Абдзіраловіча, народ надзяляў «кожную абычаёвую форму» [1, с. 11].

Беларускі культуролаг Э. С. Дубянецкі вызначае этас як абагульненую характарыстыку культуры дадзенай сацыяльнай супольнасці, што выяўляецца ў сістэме дамінуючых каштоўнасцей і норм паводзін, ідэалаў і маральных імператываў [8, с. 366].

Ю. В. Чарняўская разумее этас як культурна-сэнсавую мадэль, якая служыць звяном паміж успрыманнем, уяўленнем і практыкай, зыходзячы з прынятых у культуры суадносін «магчымага – немагчымага», «дапушчальнага – недапушчальнага», «пажаданага – выключанага» [18]. Яна зрабіла ўклад у тэарэтычную распрацоўку паняцця «этас», надала шмат увагі этасу этнічнай супольнасці як носьбітам традыцыйнай культуры.

На нашу думку, для характарыстыкі нацыянальнага этасу важным з'яўляецца вызначэнне сфер жыцця, у якіх праяўленне каштоўнасных і асэнсаваных жыццёвых арыентацый індывіда характарызуе яго найперш як прадстаўніка нацыі. Зыходзячы з мэт нацыянальнага руху, якія акрэслены Э. Смітам (аўтаномія, адзінства, саматоеснасць) [16, с. 162], можна вызначаць сферы выяўлення нацыянальнага этасу: уладна-палітычная сфера, сацыяльная сфера і культурная сфера.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падсумоўваючы розныя інтэрпрэтацыі паняцця «этас», можна сцвярджаць, што агульным з'яўляецца яго разуменне як унутрыкультурнай асновы, якая знаходзіць свой выраз у маральных нормах пэўнай групы. Улічваючы значнасць працэсу сацыялізацыі пры засваенні асобай культурных установак, нельга не пагадзіцца з меркаваннем даследчыкаў аб уплыве на характар этасу рознаўзроўневых груп камунікацыі яе прадстаўнікоў. У сваіх працах М. Асоўская паказала таксама зменлівасць зместу этасу ў гістарычнай перспектыве. Дарэчы, амаль усе вышэйадзначаныя даследчыкі ўказваюць на яго сувязь з рэальнымі жыццядзейнымі практыкамі сацыяльнай групы. Такім чынам, мы вызначаем нацыянальны этас як характарыстыку культуры, якая выяўляецца ва ўстойлівай сістэме каштоўнасцей, ідэалаў і норм і рэгулюе паводзіны прадстаўнікоў нацыянальнай супольнасці ва ўладна-палітычнай, сацыяльнай і культурнай сферы.

Асноўным камунікатыўным сродкам, які распаўсюджвае ў межах нацыянальнай супольнасці каштоўнасці, нормы і ідэалы, з'яўляецца высокая пісьмовая культура. Значнае месца ў вывучэнні этасу займае мастацкая культура, публіцыстычныя творы ідэолагаў нацыянальнага руху, навуковыя і філасофскія працы, створаныя ў той ці іншы перыяд нацыянальных творчых працэсаў. Важным таксама з'яўляецца параўнанне адпаведных сфер выяўлення этасу этнічнай і нацыянальнай супольнасці. Нягледзячы на тое, што суб'екты традыцыйнага і нацыянальнага этасу не тоесныя паняцці, нормы, каштоўнасці і ідэалы этнасу могуць засвойвацца, пераасэнсоўвацца і мадыфікавацца ў нацыянальнай культурнай творчасці, мадэлях сацыяльнага і палітычнага ўладкавання.

Уладна-палітычная сфера можа разглядацца для характарыстыкі нацыянальнага этасу не толькі тады, калі нацыя атрымала сваю інстытуалізацыю ў выглядзе нацыянальнай дзяржавы, але і тады, калі імкнецца да здабыцця дзяржаўнасці як формы ідэальнага ўвасаблення і рэалізацыі свайго патэнцыялу. Як правіла, гэта здзяйсняецца падчас нацыянальнага руху. Пры аналізе ўладна-палітычнай сферы найперш надаецца ўвага тым нормам, якія рэгулююць працэсы кіравання асобай ці грамадствам, зыходзячы з агульнанацыянальных ці агульнадзяржаўных задач, вызначаюць правы і абавязкі суб'ектаў і аб'ектаў кіравання, легітымнасць той ці іншай улады, вобраз справядлівага (ці несправядлівага) кіраўніка.

Для вызначэння нацыянальнага этасу беларусаў мы разгледзелі некалькі значных твораў дзеячаў айчыннай культуры. Так, лідар паўстання 1863–1864 гг. К. Каліноўскі ў газеце «Мужыцкая праўда», праводзячы, магчыма, першую ў гісторыі беларусаў спробу нацыянальнай агітацыі, неаднаразова падкрэсліваў несправядлівасць улады цара і паноў і заклікаў народ да самастойнага кіравання на сваёй зямлі. У чацвёртым нумары «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскі коратка, але



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грунтоўна вызначаў ролю дзяржавы і палітычнай улады ў жыцці грамадства: «Для таго, каб была справядлівасць і праўда на свеце, а злыя людзі не збыткавалі і крыўды другім не рабілі, е ронд, што бярэ падаткі, робіць школы, наўчае кажнага, каб жыў па праўдзе, становіць суд. <...> І як добры слуга глядзіць худобы гаспадарскай і слухае свайго гаспадара, так добры ронд глядзець павінен шчасця людзей, слухаць народу і рабіці так, як народаві лепей» [9, с. 32–33]. Такім чынам, тэзіс «не народ для ўрада, а ўрад для народа» на працягу ўсяго перыяду нацыянальных будаўнічых працэсаў заставаўся цэнтральным ідэалам дзяржаўнага ўладкавання. Справядлівасць улады з'яўляецца неад'емнай часткай яе легітымнасці, якую неабходна падтрымліваць добрасумленным выкананнем сваіх грамадзянскіх абавязкаў. Дзяржава са свайго боку мусіць павышаць дабрабыт, выконваць ахоўныя, прававыя функцыі, спрыяць прагрэсу грамадства.

Вобраз прадстаўніка ўлады на этапе афармлення беларускай дзяржаўнасці выразна адлюстраваны ў асобе Аляксандра Чарвякова ў рамане В. Быкава «Знак бяды». Ён падаецца заступнікам і ахоўнікам народных інтарэсаў. Будучы па натуры спакойным і сціплым чалавекам, разважлівым кіраўніком, ён падтрымлівае грашыма сям'ю Багацькаў, якая апынулася ў складаных жыццёвых умовах, адначасова жадае ім багацця і здароўя.

У традыцыйнай культуры негатыўную адзнаку несправядлівых кіраўнікоў звычайна атрымлівалі тыя надзеленыя ўладай асобы, з якімі даводзілася мець непасрэдныя штодзённыя зносіны (пан, аканом, чыноўнік), у той час як асоба цара ці князя ў вуснай традыцыі надзялялася сакральнымі рысамі.

У сацыяльнай сферы выяўлення нацыянальнага этасу існуючыя маральныя нормы заклікаіны адлюстраваць уяўленні пра справядлівае сацыяльнае ўладкаванне грамадства, узаемаадносіны індывіда і розных сацыяльных груп унутры нацыянальнай супольнасці, а таксама з іншымі нацыямі. Адзін з пачынальнікаў сучаснай літаратуры В. Дунін-Марцінкевіч ужо толькі адным фактам напісання сваіх твораў на польскай і беларускай мовах дэклараваў ідэю культурнай і сацыяльнай роўнасці народных мас і эліты. Асуджэнне індывідуалізму і эгаізму суправаджалася заклікам да кансалідацыі ўсіх слаёў грамадства. Гэта значна адрозніваецца ад уяўленняў у межах традыцыйнай культуры, дзе назіраецца стрымана-насцярожанае, а часам і негатыўнае стаўленне да «чужых» – прадстаўнікоў іншых класаў, этнічных груп ці выхадцаў з іншага асяроддзя. У фальклоры яны звычайна супрацьпастаўляюцца «мясцовым», «тутэйшым», што вынікае з архаічнага механізма этнічнай самаідэнтыфікацыі «мы – яны». Адметнай рысай «чужых» была іншамоўнасць, ім таксама прыпісваліся разнастайныя фізічныя недахопы, невысокія разумовыя здольнасці, дачыненні з нячыстай сілай,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

негатыўныя маральна-этычныя рысы і інш. (казкі «Як Сцёпка з панам гаварыў», «Мужык Раман і жыды») [11].

Цэнтральнае месца ў даследаванні іерархіі каштоўнасцей, якія рэгулююць паводзіны ў межах культурнай сферы, займае вывучэнне норм, якія арганізуюць працэс стварэння, захавання, распаўсюджвання, трансляцыі і засваення культурнага досведу. Іх вывучэнне дае ўяўленне аб належным стаўленні да здабыткаў нацыянальнай культуры і іх ролі ў жыцці грамадства. У прадмове да «Дудкі беларускай» Ф. Багушэвіч падкрэслівае ролю беларускай мовы як галоўнага фактару, які аб'ядноўвае супольнасць у агульнае цэлае. Беларуская мова як самакаштоўная («Богам дадзеная») разглядаецца ў якасці асновы для стварэння высокай нацыянальнай культуры, у прыватнасці літаратуры [5, с. 87–88]. Характэрна, што ва ўмовах традыцыйнай супольнасці стварэнне ўзораў пісьмовай культуры на «мужыцкай мове» разглядалася яе прадстаўнікамі як штосьці дзіўнае і нават непрымальнае.

Такім чынам, этас з'яўляецца ўстойлівым кампанентам нацыянальнай ідэнтычнасці, выразна выяўляючы сябе ў шырокім коле сацыяльных практык. У сферах выяўлення нацыянальнага этасу індывід выступае як прадстаўнік нацыянальнай супольнасці, ідэнтыфікуе сябе як грамадзянін дзяржавы, удзельнік сацыяльных адносін і носьбіт пэўнай культуры. Нацыянальны этас вызначае стыль жыцця грамадства. На яго фарміраванне значны ўплыў аказвае этас традыцыйнай супольнасці, некаторыя элементы якога пераасэнсоўваюцца і напаўняюцца новым зместам ва ўмовах нацыянальных творчых працэсаў.

У наш час вызначальнымі для нацыянальнага этасу беларусаў сталі ідэі прыярытэту інтарэсаў народа, справядлівасці, роўнасці і салідарнасці, пераадолення этнічных і сацыяльных бар'ераў.


1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. Антропология А. Кребера [Электронный ресурс] // Україн. діловий інформ. каталог. – Режим доступа: http://udik.com.ua/books/book-510/chapter-17693/. – Дата доступа: 10.04.2015.

3. *Анчел, Е.* Этос и история / Е. Анчел ; пер. с венг. М. А. Хевеши. – М. : Мысль, 1988. – 126 с.

4. *Аристотель.* Этика. Политика. Риторика. Поэтика. Категории / Аристотель. – Минск : Литература, 1998. – 1392 с. – (Серия «Классическая философская мысль»).

5. *Багушэвіч, Ф.* Творы / Ф. Багушэвіч. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 152 с.

6. *Вебер, М.* Протестантская этика и дух капитализма / М. Вебер. – Ивано-Франковск : Ист-Вью, 2002. – 352 с.

7. *Вундт, В.* Проблемы психологии народов / В. Вундт ; пер. с нем. Н. В. Самсонова. – Изд. 3. – М. : URSS, 2009. – 132 с.

8. *Дубянецкі, Э. С.* Этас / Э. С. Дубянецкі // Культуралогія : энцыкл. даведнік / Э. С. Дубянецкі. – Мінск, 2003. – С. 366.

9. *Каліноўскі, К.* Мужыцкая праўда № 4 / К. Каліноўскі // За нашую вольнасць : творы, дакументы / склад. Г. В. Кісялёў. – Мінск, 1999. – 464 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Коваль, Е. В.* Этос информационного общества : автореф. дис. ... канд. филос. наук : 09.00.05 / Е. В. Коваль ; Мордов. гос. ун-т им. Н. П. Огрева. – Саранск, 2011. – 18 с.
*11. Лобач, У.* Чужынец / У. Лобач // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; пад рэд. Т. Валодзінай. – Мінск, 2011. – С. 521–522.
*12. Лурье, С.* Рут Бенедикт : учение об этосе культуры [Электронный ресурс] / С. Лурье // Психологическая антропология: история, современное состояние, перспективы / С. Лурье. – Режим доступа: http://ethnopsyhology.narod.ru/study/history/benedikt.htm. – Дата доступа: 10.04.2015.
*13. Оссовская, М.* Рыцарь и буржуа. Исследования по истории морали / М. Оссовская. – М. : Прогресс, 1987. – 528 с.
*14. Салтыкова, О. В.* Национальный этос и ценности трудовой деятельности : автореф. дис. ... канд. филос. наук : 09.00.11 / О. В. Салтыкова ; Твер. гос. ун-т. – Тверь, 2005. – 19 с.
*15.* Синтетическая этика Фомы Аквинского [Электронный ресурс] // Большая онлайн-библиотека. – Режим доступа: http://www.e-reading.club/chapter.php/99171/13/Zubanova_-_Etika.html. – Дата доступа: 17.02.2016.
*16. Сміт, Э. Д.* Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / Э. Д. Сміт. – Мінск : Беларус. Фонд Сораса, 1995. – 270 с.
*17.* Фрагменты Гераклита // Материалисты древней Греции: Собрание текстов Гераклита, Демокрита и Эпикура / общ. ред. М. А. Дынника ; Акад. наук СССР ; Ин-т философии. – М., 1955. – С 41–52.
*18. Чернявская, Ю. В.* Этос и габитус как формы организации и трансляции смысловых содержаний этнической культуры: к проблеме преемственности и развития // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамадскіх навук. – 2008. – № 2(33). – С. 36–41.
*19. Шелер, М.* Избранные произведения / М. Шелер. – М. : Гнозис, 1994. – 490 с.

*K. Lysak*

**The national ethos: the concept and the detection area**

*The author considers the interpretations of the concept of "ethos" from antique sources to the emergence of modern ethnic and psychological, anthropological, sociological and philosophical works. The term "ethos" originally stood for stable individual traits, but over time it was expanded to the value of cultural characteristics, reflecting in a system of standards, values and ideas of social groups being expressed in its practical activity. The author describes those areas of life where the idea of the perfect human relations allows characterizing national ethos. In addition, the author tries to identify the ethical orientations that should govern the relations of the Belarusian society in the sphere of power relations between different social groups, as well as in the creation, preservation, dissemination and development of national culture samples.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 20.06.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ